# Памяці вучонага

## ЛЕАНІД АЛЯКСАНДРАВІЧ ЖЫЛУНОВІЧ



10 мая 2010 г. пасля цяжкай працяглай хваробы не стала ветэрана універсітэцкай адукацыі, дацэнта кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта Леаніда Аляксандравіча Жылуновіча.

Л.А. Жылуновіч нарадзіўся 16 сакавіка 1949 г. у в. Стары Свержань Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў настаўніцкай сям'і. Працоўную дзейнасць пачаў з 1966 г. рабочым-рулетчыкам у Бюро тэхнічнай інвентарызацыі г. Мінска. Любоў да мінуўшчыны свайго краю, прага ведаў прывялі яго ў 1967 г. на вячэрняе аддзяленне гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Тут стараннага студэнта заўважылі намеснік дэкана А.П. Ігнаценка і загадчык кафедры гісторыі БССР Л.С. Абэцэдарскі і прапанавалі яму ў 1970 г. працу лабаранта кафедры. Такім чынам Леанід Аляксандравіч звязаў свой лёс з універсітэтам, атрымаў тут вышэйшую гістарычную адукацыю (1973), скончыў аспірантуру (1980) і абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Дзейнасць партыйных арганізацый Беларусі па павышэнню культурнага ўзроўню рабочых саўгасаў і калгаснікаў у гады дзевятай пяцігодкі» (1985 г., навуковы кіраўнік – прафесар У.Р. Івашын).

Дзе б ні прыходзілася працаваць Л.А. Жылуновічу – метадыстам вучэбнага аддзела, выкладчыкам падрыхтоўчага аддзялення, дацэнтам кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, а з 1990 г. на гістарычным факультэце БДУ на кафедрах гісторыі Беларусі і гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў – усюды праяўляўся яго талент педагога і выкладчыка, выхавацеля студэнцкай моладзі. На высокім навуковым і вучэбна-метадычным узроўні ён чытаў лекцыі і праводзіў практычныя заняткі па курсу «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі», прафесійна ажыццяўляў кіраўніцтва курсавымі і дыпломнымі працамі студэнтаў, педагагічнай практыкай. За час сваёй амаль саракагадовай педагагічнай дзейнасці Леанід Аляксандравіч нярэдка выступаў у студэнцкіх інтэрнатах, з'яўляўся куратарам зямляцтваў замежных студэнтаў, кіраваў зводным студэнцкім сельскагаспадарчым атрадам, быў кансультантам Камітэта маладзёжных арганізацый рэспублікі, прымаў удзел у стварэнні Музея гісторыі БДУ, неаднаразова працаваў намеснікам адказнага сакратара прыёмнай камісіі універсітэта.

У цэнтры навуковых зацікаўленасцей Л.А. Жылуновіча ў апошнія часы знаходзіліся праблемы станаўлення і эвалюцыі органаў улады і кіравання ў Вялікім Княстве Літоўскім, асноўныя моманты развіцця гістарыяграфіі гісторыі Беларусі, а таксама культурная спадчына беларускай вёскі. Па гэтай праблематыцы ім распрацаваны некалькі спецыяльных курсаў, у сааўтарстве апублікаваны вучэбныя дапаможнікі па айчыннай гісторыі і прадмету «Чалавек, грамадства, дзяржава», усяго больш 50 артыкулаў, тэзісаў, рэцэнзій. Падрыхтаваны адзін кандыдат навук.

За заслугі ў вучэбна-выхаваўчай і навуковай працы Леанід Аляксандравіч Жылуновіч тройчы ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі БДУ, дыпломам Камітэта маладзёжных арганізацый СССР. Л.А. Жылуновіч карыстаўся глыбокай павагай у землякоў, для якіх ён быў дасведчаным кансультантам па гісторыі роднага краю, збіральнікам музейнай калекцыі рэчаў старога сялянскага побыту, простым і даступным аднавяскоўцам.

Светлая памяць аб добразычлівым чалавеку, педагогу і навукоўцу назаўсёды захаваецца ў сэрцах тых, з кім яго звёў лёс.

***Ю.Л. Казакоў,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык кафедры гісторыі Беларусі
старажытнага часу і сярэдніх вякоў
***П.А. Лойка,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
***У.А. Сосна,***
кандыдат гістарычных навук, дацэнт